Аўтар: Рэдакцыя
01.04.2018 00:00

Дакумент
моладзі аб Касцёле
прадстаўлены
ў Ватыкане

У ім распавядаецца пра тое, як выглядаюць Касцёл і свет вачамі маладога пакалення, а таксама якія чаканні адносна служэння Касцёла маюць маладзёны.

Дакумент з'яўляецца падсумаваннем перадсінадальных дэбатаў моладзі з усяго свету, што трывалі апошні час. Складаецца з 3-ох частак. Першая прысвечана выклікам і магчымасцям, якія стаяць перад сучаснай моладдзю; другая распавядае пра веру і пакліканне, праніклівасць і спадарожнічанне маладым; трэцяя – аб фармацыйных і душпастырскіх дзеяннях Касцёла.

Гэта першы ў гісторыі ватыканскі дакумент, цалкам падрыхтаваны маладымі людзьмі. У Пальмовую нядзелю ён быў перададзены папе Францішку. Гэта зрабіў прадстаўнік Панамы – краіны, дзе ў наступным годзе пройдуць Сусветныя дні моладзі. †

Каля сотні тысяч
чалавек вырушылі на
Экстрэмальны
Крыжовы шлях

Набажэнства адбывалася на тэрыторыі 18-ці розных краін у больш за 300 мясцовасцях. Для гэтай мэты было падрыхтавана звыш 700 трас. У бягучым годзе сваё бла- слаўленне ўдзельнікам Экстрэмальнага Крыжовага шляху перадаў Святы Айцец Францішак. Пантыфік заахвоціў іх даверыць Хрысту сябе, свае сем'і, сяброў і непрыяцеляў, каб у кожным з іх пасяліўся супакой і моц укрыжаванага і ўваскрослага Хрыста.

Аўтар: Рэдакцыя
01.04.2018 00:00

